ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 35 (830) ● Чацвер, 2 снежня 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

# ЛЕНІНСКІМ КУРСАМ

У жыцці нашай партыі і дзяржавы, у жыцці ўсяго савецкага народа прайшоўшыя дні азнаменаваны важнымі палітычнымі падзеямі, якія маюць велізарнае значэнне для паспяховага руху Краіны Саветаў па шляху да камунізму, для няўхільнага ўмацавання яе магутнасці, далейшага павышэння палітычнага і маральнага аўтарытэту ў свеце.

22—23 лістапада адбыўся чарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Пленум адобрыў у асноўным праекты Дзяржаўнага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1971—1975 гады, Дзяржаўнага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1972 год, Дзяржаўнага бюджэту СССР на 1972 год і пастанавіў унесці іх на разгляд сесіі Вярхоўнага Савета СССР.

Пленум заслухаў даклад Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта КПСС тав. Л. І. Брэжнева «Аб міжнароднай дзейнасці ЦК КПСС пасля XXIV з'езда партыі». У прынятай пастанове аднадушна адабраецца і цалкам падтрымліваецца праведзеная Палітбюро ЦК работа па ажыццяўленню прапанаванай з'ездам знешнепалітычнай праграмы.

Следам за Пленумам Цэнтральнага Камітэта, 24—26 лістапада, праходзіла трэцяя сесія Вярхоўнага Савета СССР. Яна разгледзела і аднагалосна зацвердзіла прадстаўленыя праекты новай пяцігодкі і плана на 1972 г., з дакладам па якіх выступіў Старшыня Савета Міністраў СССР тав. А. М. Касыгін. Сесія зацвердзіла таксама бюджэт на 1972 г.

Рашэнні Пленума ЦК і сесіі Вярхоўнага Савета СССР—гэта новае сведчанне вялікай жыццёвай сілы сацыялістычнага ладу, усё большага ўплыву нашай дзяржавы на ўвесь ход сусветных падзей.

Дзевяты пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі СССР—дакумент сапраўды гістарычнага значэння.

Галоўная задача пяцігодкі заключаецца ў тым, каб забяспечыць значны ўздым матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа на аснове высокіх тэмпаў развіцця сацыялістычнай вытворчасці, павышэння яе эфектыўнасці, навукова-тэхнічнага прагрэсу і паскарэння росту прадукцыйнасці працы.

Пяцігадовы план разгорнут па гадах, па міністэрствах, ведамствах і саюзных рэспубліках. За пяцігоддзе трэба павялічыць нацыянальны даход амаль на 39 працэнтаў. Вытворчасць прамысловай прадукцыі ўзрасце на 47 працэнтаў, сельскагаспадарчай прадукцыі ў калгасах і саўгасах (у разліку на сто гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў)—прыкладна на адну трэць. Прадугледжана павысіць рэальныя даходы на душу насельніцтва на 30,8 працэнта. Больш як на 40 працэнтаў павялічваюцца грамадскія фонды спажывання. Развіццё савецкай эканомікі і павышэнне ўзроўню жыцця народа ідуць па няспынна ўзыходнай лініі.

Пра грандыёзнасць маючых адбыцца здзяйсненняў, пра гіганцкія маштабы нашага эканамічнага росту пераканаўча гавораць канкрэтныя лічбы. У 1975 годзе кошт усіх асноўных фондаў у народнай гаспадарцы складзе больш як трыльён рублёў. Гадавы аб'ём прамысловай прадукцыі ў грашовым выражэнні дасягне амаль 550 мільярдаў рублёў. Выпрацоўка электраэнергіі перавысіць адзін трыльён кілават-гадзін. Будзе выплаўлена каля 150 мільёнаў тон сталі. Здабыча нафты складзе прыкладна 500 мільёнаў тон. Вытворчасць цэменту дасягне ўзроўню 125 мільёнаў тон. Выпуск тканін перавысіць 11 мільярдаў квадратных метраў, а вытворчасць скуранога абутку складзе 830 мільёнаў пар. К канцу пяцігодкі валавы збор зерня павінен перавысіць 200 мільёнаў тон, вытворчасць мяса дасягне прыкладна 16 мільёнаў тон, малака—100 мільёнаў тон, яек—52 мільярды штук.

Пяцігадовы план прадугледжвае вырашэнне вялікіх задач сацыяльнага развіцця, значнае павышэнне матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа. Праграма росту дабрабыту закранае ўсе бакі матэрыяльнага і духоўнага жыцця насельніцтва.

Савецкі народ аднадушна адабрае рашэнні Пленума Цэнтральнага Камітэта КПСС і сесіі Вярхоўнага Савета СССР, ленінскую ўнутраную і знешнюю палітыку нашай партыі і дзяржавы. Гэтыя рашэнні натхняюць савецкіх людзей на новыя выдатныя здзяйсненні на славу сацыялістычнай Радзімы. Адзінства партыі і народа, вернасць ленінскім ідэям—у гэтым крыніца нашай сілы, залог будучых перамог у барацьбе за трыумф справы міру і прагрэсу, справы камунізму.

НАП У БДУ

# ЛЕПШАЕ— У ПРАКТЫКУ

Сёлетняй вясной у БДУ створан савет па навуковай арганізацыі працы і кіравання ў вучэбна-выхаваўчым працэсе, адна з секцый якога займаецца навуковай арганізацыяй вучэбнага працэсу (НАВП). На пасяджэнні секцыі ў кастрычніку гэтага года была заслухана справаздача аб рабоце метадычных камісій матфака. Аўтара гэтай справаздачы П. Н. Князева мы папрасілі выступіць у газеце. Спадзяёмся, што і нашым чытачам будзе цікава пазнаёміцца з метадычнай работай на матфаку. Абмен вопытам на старонках «Беларускага універсітэта», несумненна, прынясе карысць і паслужыць удасканаленню такой важнай і складанай галіны, якой з'яўляецца метадычная работа ва ўсіх яе шматлікіх аспектах.

МЕТАДЫЧНЫЯ камісіі на матэматычным факультэце працуюць параўнаўча нядаўна. За гэты час больш ці менш вызначылася кола задач, якія яны павінны рашаць. Хоць асноўная мэта — павышэнне паспяховасці — застаецца нязменнай, паступова накопліваецца вопыт у самым, бадай, цяжкім пытанні: якім чынам дабівацца павышэння паспяховасці?

Вядома, метадычныя камісіі павінны займацца пытаннямі павышэння ўзроўню выкладання, паляпшэння выхаваўчай работы, распаўсюджаннем вопыту лепшых выкладчыкаў. Але гэтая частка дзейнасці метадычных камісій адносіцца хутчэй да работы сярод выкладчыкаў. Ёсць яшчэ і агульныя метадычныя задачы: вывучэнне і паляпшэнне вучэбных планаў і праграм, паляпшэнне методыкі выкладання канкрэтных прадметаў з мэтай дабіцца больш поўнага засваення студэнтамі праграмнага матэрыялу. Больш складаная сфера — работа сярод студэнтаў.

Вопыт метадычных камісій матэматычнага факультэта, накоплены пры рашэнні некаторых з упамянутых пытанняў, як нам здаецца, прадстаўляе цікавасць і для работнікаў іншых факультэтаў.

У адрозненне, напрыклад, ад фізічнага факультэта, дзе камісіі арганізаваны па спецыяльнасцях і ахопліваюць студэнтаў розных курсаў, у матэматыкаў арыентацыя на курс.

Натуральна, што ў метадычных камісій розных курсаў свае спецыфічныя галоўныя задачы, але ёсць многа і агульных. Метадычнай камісіі першага курса выпадае найбольш цяжкі ўчастак работы.

Гэтыя цяжкасці звязаны з няўменнем першакурснікаў працаваць пад меншым кантролем, чым у школе, і, акрамя таго, з адрозненнямі ў арганізацыі навучальнага працэсу. Таму метадычная камісія першага курса арганізуе лекцыі тыпу «Як слухаць і канспектаваць лекцыю па матэматыцы», «Як працаваць з падручнікам» і г. д. З падобнымі лекцыямі выступаюць найбольш кваліфікаваныя работнікі (напрыклад, некалькі разоў лекцыі такога зместу чытаў прафесар Ю. С. Багданаў). Курсавыя метадычныя камісіі старанна вывучаюць змест праграм па матэматычных прадметах і ўзгадняюць іх з лектарамі, каб пазбегнуць паралелізму і паўтору аднолькавага матэрыялу ў розных курсах. Гэтым дасягаецца меншая насычанасць лекцый, што аблягчае работу студэнтаў.

У пачатку семестра складаецца графік кантрольных работ і калёквіумаў па ўсіх прадметах (уключаючы і не матэматычныя). Так забяспечваецца раўнамернае іх размеркаванне, дастатковы час для падрыхтоўкі. Графік кантрольных работ і калёквіумаў загадзя аб'яўляецца студэнтам.

Больш складанае пытанне — аб бюджэце часу студэнта і аб'ёме дамашніх заданняў. Вывучэнне паказвае, што больш 3—4 гадзін у дзень на пазааўдыторную работу студэнт выдзеліць не можа (гэта, у прыватнасці, выявілася і ў анкетных апытаннях, якія неаднаразова праводзіліся на розных курсах матэматычнага факультэта). Кіруючыся гэтым, пасля шматлікіх спроб метадычныя камісіі факультэта вырашылі вызначаць аб'ём дамашняга задання з разліку адзін к аднаму, г. зн. калі ўзяць практычныя заняткі (дзве акадэмічныя гадзіны) па канкрэтнаму прадмету, то аб'ём дамашняга задання павінен быць не больш зробленага на гэтых практычных занятках. Вядома, што студэнт на такое заданне затраціць менш дзвюх акадэмічных гадзін, бо ён ужо падрыхтаваны да гэтага задання ў аўдыторыі. Такі аб'ём дамашняга задання ўяўляецца дапушчальным і па іншых (не матэматычных) прадметах.

Наступная цяжкая задача — кантроль за вучэбнай работай студэнтаў. На практычных занятках ён здзяйсняецца проста, а лектару даводзіцца правяраць студэнта з дапамогай беглага апытання ў пачатку кожнай лекцыі (на працягу некалькіх хвілін), а таксама ў час калёквіумаў, якіх у семестры многа не правядзеш. Часткова кантроль за вывучэннем лекцыйнага матэрыялу пераносіцца на выкладчыка, які вядзе практычныя заняткі. І ўсё ж поўны кантроль не ўдаецца здзейсніць, таму што некаторая частка лекцыйнага матэрыялу не адлюстроўваецца ў практычных занятках. Акрамя таго, на практычных занятках выкарыстоўваюцца толькі вынікі даказаных тэарэм, а метадам доказаў належнай увагі ўдзяліць немагчыма.

Для кантролю выкарыстоўваецца таксама вядомая і, як нам здаецца, даволі эфектыўная форма — кансультацыі. Прычым на кансультацыю некаторыя студэнты выклікаюцца, а іншыя запрашаюцца.

Метады эфектыўнага кантролю за вучэбнай работай студэнтаў яшчэ далёкія ад дасканаласці і патрабуюць далейшага пошуку новых форм.

Курсавыя метадычныя камісіі займаюцца і прафілактыкай непаспяховасці. На пасяджэннях адстаючыя студэнты (па выніках практычных заняткаў) растлумачваюць прычыны непаспяховасці, іх папярэджваюць аб магчымасці атрымання на экзаменах нездавальняючай ацэнкі.

Канешне, усіх пытанняў, якімі займаюцца курсавыя метадычныя камісіі, мы тут не пералічылі, таму што іх работа шматгранная, як і вучэбна-выхаваўчы працэс. Да таго ж невядомы вопыт работы камісій іншых факультэтаў, які, безумоўна, утрымлівае многа каштоўнага.

У заключэнне адзначым недахопы камісій матэматычнага факультэта. І перш за ўсё тое, што з іх поля зроку выпала вячэрняе аддзяленне. Мэтазгодна ў кожную курсавую метадычную камісію ўключыць выкладчыкаў, працуючых на адпаведных курсах вячэрняга аддзялення, якія займаліся б спецыяльна метадычнымі пытаннямі вячэрняга навучання. А такіх пытанняў, характэрных іменна для вячэрняга навучання, нямала. Акрамя таго, слабая сувязь паміж метадычнымі камісіямі і акадэмічным сектарам камсамольскага і прафсаюзнага (студэнцкіх) бюро факультэта. З акадэмічнымі сектарамі партыйнага і прафсаюзнага бюро факультэта падтрымліваюцца дастаткова трывалыя сувязі.

Яшчэ адна асаблівасць заключаецца ў тым, што курсавыя метадычныя камісіі малодшых курсаў, як правіла, працуюць лепш, чым старэйшых курсаў.

П. КНЯЗЕЎ.

# «ЖУРНАЛІСТ»—ГАЗЕТА ШТОТЫДНЁВАЯ

Прапанова аб тым, каб факультэцкая насценгазета «Журналіст» выходзіла кожны тыдзень, выклікала на факультэце цэлую дыскусію.

Партыйнае бюро журфака, на якім разглядалася пытанне аб насценным друку, пастанавіла:

«З мэтай больш дэталёвага асвятлення вучэбнага і практычнага працэсу, партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай работы на факультэце прызнаць мэтазгодным штотыднёвы выпуск насценнай газеты «Журналіст». На папярэднім пасяджэнні прафесар Васіль Андрэевіч Пыжкоў быў зацверджан адказным за друк.

Пачалася клапатлівая работа па пераходу на новую перыядычнасць выпуску газеты. Праз некалькі дзён былі створаны рэдакцыйная калегія і чатыры зменныя выпускаючыя рэдакцыі. У склад кожнай рэдакцыі, апрача рэдактара, увайшлі адказны сакратар, мастак, фотакарэспандэнт і машыністка. Пры рэдакцыйнай калегіі была арганізавана група спецкарэспандэнтаў.

Асноўныя клопаты па выпуску ляглі на плечы студэнтаў журфака Віктара Аўчарэнкі, Валерыя Паўловіча, Мікалая Дыма, Валерыя Дранчука і іншых.

Прайшло яшчэ зусім мала часу, і вынікі, напэўна, рабіць рана. Аднак сам факт, што выйшла ўжо шэсць нумароў газеты і ўсе яны вызначаюцца прынцыповасцю, шырынёй і глыбінёй паказу шматграннага факультэцкага жыцця, пранікненнем у духоўны свет студэнта, дае падставу меркаваць, што газета становіцца сапраўдным сябрам і дарадчыкам журфакаўцаў.

Сёлета ў газеце ўведзен рад новых рубрык: афіцыйны аддзел, хроніка факультэцкага жыцця, студэнцкі гумар і г. д. Плануюцца спецыяльныя нумары «Журналіста». Так, нядаўна адбыўся выпуск, прысвечаны вынікам летняй вучэбнай і вытворчай практыкі. Неўзабаве выйдзе літаратурны нумар.

У плане на першы вучэбны семестр гэтага года мы сканцэнтравалі ўвагу, апрача святочных і спецыяльных нумароў, на такіх праблемах і тэмах, як «права вучыцца», «пошук вядзе журналіст», «у аб'ектыве мы», «цішэй, ідзе сесія» і многіх іншых. Пастараемся даць сапраўдны бой запазычнікам і прагульшчыкам. Шмат увагі будзем удзяляць выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў, наладжванню іх культурнага адпачынку. Не застанецца па-за ўвагай і інтэрнат.

Значную дапамогу аказваюць рэдакцыйнай калегіі дэканат і партыйнае бюро. У прыватнасці, пытанне аб насценным друку нярэдка разглядаецца на партыйных сходах, даводзіцца нам трымаць справаздачу і на партыйным бюро факультэта.

Безумоўна, не ўсё яшчэ гладка ў нашай рабоце. Аднак недахопы адступаюць перад настойлівасцю і творчым імкненнем журфакаўцаў. Штотыднёвы выпуск газеты «Журналіст» на поўных правах увайшоў у кіпучае факультэцкае жыццё.

У. ДАЛЬКОЎ,
галоўны рэдактар газеты «Журналіст»

# СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ № 5

**У кастрычніку—лістападзе бягучага года ва універсітэце прайшлі справаздачна - выбарныя сходы і канферэнцыі па народнаму кантролю. На іх прысутнічала 1.937 дэлегатаў.**

**У спрэчках па справаздачных дакладах выступіла 65 чалавек.**

**У састаў 16 груп народнага кантролю выбрана 228 чалавек, у тым ліку: 172 выкладчыкі і супрацоўнікі, 56 студэнтаў, 85 камуністаў, 79 камсамольцаў, 98 жанчын. Упершыню народнымі кантралёрамі выбран 141 чалавек.**

# ЗАЎСЁДЫ Ў ДАЗОРЫ

НА МІНУЛЫМ тыдні адбылася канферэнцыя, на якой давала справаздачу аб сваёй рабоце універсітэцкая група народнага кантролю.

У састаў групы было выбрана 47 чалавек, якія прадстаўлялі калектывы ўсіх асноўных структурных падраздзяленняў універсітэта. Членамі групы з'яўляліся 13 выкладчыкаў, 11 супрацоўнікаў і 23 студэнты. У ліку народных кантралёраў было 14 камуністаў і 21 камсамолец, 16 жанчын.

Уся работа групы праходзіла на аснове планаў, узгодненых з рэктаратам і партыйным камітэтам, а дзейнасць народных кантралёраў працякала ў цесным кантакце з партыйным камітэтам універсітэта, мясцовым і прафсаюзным камітэтамі, камітэтам ВЛКСМ. У практыку работы настойліва ўкараняўся прынцып галоснасці. Матэрыялы групы публікаваліся на «Старонках народнага кантролю» ва універсітэцкай шматтыражнай газеце, якія пачалі выпускацца з мая 1970 года, выкарыстоўваліся ў выступленнях членаў груп народнага кантролю на партыйных, прафсаюзных сходах, пасяджэннях саветаў факультэтаў і кафедр. Планы, усе пастановы ГНК рэгулярна вывешваліся на стэндзе ГНК.

У групе народнага кантролю было ўтворана 7 сектараў. Кіраўнікі сектараў, старшыня і сакратар ГНК ўваходзілі ў бюро групы.

**СЕКТАР АРГМАСАВАЙ РАБОТЫ** (кіраўнік **Е. А. Акінчыц**).

У справаздачны перыяд гэты сектар працаваў добра і здзейсніў немалую работу. Яго намаганнямі была створана «Школа народных кантралёраў» для членаў ГНК, камсамольскіх «пражэктарыстаў» і кантралёраў прафсаюзных арганізацый. Былі праведзены чатыры заняткі. Перад кантралёрамі выступілі загадчык аддзела КНК БССР О. А. Здаравенін з лекцыяй «Аб задачах ГНК у вышэйшых навучальных установах», загадчык аддзела КНК БССР С. А. Пазнякоў, які расказаў аб відах праверак, метадах іх падрыхтоўкі і правядзення, дацэнт юрфака БДУ Я. М. Тагуноў з лекцыямі «Формы і метады забеспячэння галоснасці работы ГНК. Перыядычная справаздачнасць груп і іх членаў перад калектывамі працоўных аб праводзімай рабоце» і «Арганізацыя кантролю за своечасовым разглядам прапаноў, заяў і скарг і арганізацыяй прыёму працоўных». Прафесар юрфака А. В. Дулаў прачытаў лекцыю «Службовая этыка», а старшы выкладчык гэтага ж факультэта К. М. Ануфрыеў—«Савецкае заканадаўства аб адказнасці рабочых і служачых за нанесены матэрыяльны ўрон і парадак яго пакрыцця».

Па ініцыятыве сектара на пасяджэнні ГНК разглядалася пытанне аб ходзе заняткаў у «Школе народных кантралёраў». У пастанове было адзначана нездавальняючае наведванне заняткаў членамі груп геаграфічнага, матэматычнага, філалагічнага, гістарычнага факультэтаў.

Па прапанове сектара ГНК пачала наладжваць сваю работу на аснове перспектыўных планаў, разлічаных на каляндарны год. Праведзена праверка работы ГНК філалагічнага і гістарычнага факультэтаў, АГЧ, абагульнен станоўчы вопыт работы ГНК юрыдычнага факультэта.

Распрацавана «Палажэнне аб аглядзе сродкаў галоснасці ў рабоце ГНК» і з 25 па 27 сакавіка 1971 года праведзен агляд. Ён даў адчувальны штуршок укараненню сродкаў галоснасці ў работу факультэцкіх груп. Па выніках агляду I месца было прысуджана ГНК фізічнага факультэта, II — ГНК юрыдычнага факультэта і III — ГНК гістарычнага факультэта. Па прадстаўленні ГНК БДУ Кастрычніцкі раённы камітэт народнага кантролю аб'явіў старшыням груп-пераможцаў Н. Н. Хаўратовіч, П. Я. Грынкіну і М. Ф. Піліпенка падзяку з занясеннем у асабістую справу па месцы работы.

Праведзена нарада-семінар з камсамольскімі «пражэктарыстамі» універсітэта (у красавіку 1971 г.) сумесна з камітэтам камсамола БДУ.

**СЕКТАР ВУЧЭБНАЙ РАБОТЫ** (кіраўнік **Г. А. Лазерка**).

Падрыхтаваны на разгляд ГНК наступныя пытанні:

аб рабоце вочна-завочных падрыхтоўчых курсаў, вучэбнай нагрузцы загадчыкаў кафедр і прафесараў у 1969-1970 навучальным годзе на геаграфічным, філалагічным і хімічным факультэтах; вучэбнай тыднёвай нагрузцы студэнтаў I курса фізічнага і філалагічнага факультэтаў; рабоце падрыхтоўчага аддзялення; арганізацыі і правядзенні практыкі на геаграфічным факультэце і факультэце журналістыкі; матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні навучальнага працэсу на біялагічным факультэце; арганізацыі навучальнага працэсу на вячэрніх аддзяленнях хімічнага і юрыдычнага факультэтаў.

Па матэрыялах, падрыхтаваных сектарам, прымаліся адпаведныя пастановы, якія адрасаваліся тым асобам, ад якіх залежыць рашэнне пастаўленых пытанняў.

**СЕКТАР НАВУКОВАЙ РАБОТЫ** (кіраўнік **А. В. Юхневіч**).

Па прадстаўленню сектара разгледжаны наступныя пытанні: аб рабоце СНТ фізічнага факультэта і факультэта журналістыкі; выкананні плана павышэння навуковай кваліфікацыі выкладчыкаў універсітэта; выкарыстанні навуковага абсталявання на хімфаку; падрыхтоўцы навуковых кадраў праз аспірантуру.

**СЕКТАР БЫТУ** (кіраўнік **І. А. Сакалоў**).

Членамі сектара і актывістамі — супрацоўнікамі кафедры грамадзянскай абароны М. А. Козыравым і В. В. Цімафеевым была праведзена праверка стану і работы здраўпункта.

У пастанове ГНК былі адзначаны недахопы, якія мелі месца ў рабоце здраўпункта, а таксама выказана просьба да АГЧ аб аказанні здраўпункту дапамогі.

Паўторнай праверкай устаноўлена, што АГЧ рэалізавала рэкамендацыі, і здраўпункт прыведзен у належны парадак.

Праводзілася праверка правільнасці назначэння стыпендый студэнтам факультэта журналістыкі. Выяўленыя нязначныя недахопы былі ліквідаваны ў ходзе праверкі.

У маі 1971 года праверана работа некаторых сталовых і буфетаў, у якіх харчуюцца студэнты і супрацоўнікі універсітэта. Выяўлен рад недахопаў. За нядобрасумленныя адносіны да сваіх абавязкаў былі вызвалены ад работы буфетчыца т. Харламовіч і загадчык вытворчасці сталовай хімічнага корпуса т. Карпенка.

У пачатку гэтага навучальнага года сектарам сумесна з урачом СЭС Кастрычніцкага раёна Р. І. Прымаковай і супрацоўнікамі універсітэцкага здраўпункта быў праведзен рад праверак работы сталовай і буфета ў хімкорпусе і буфета у галоўным корпусе. Усе адзначаныя раней недахопы, мабыць толькі ў меншай ступені, уласцівы універсітэцкім пунктам грамадскага харчавання і ў цяперашні час.

Відавочна, наступіла пара, калі варта сур'ёзна падумаць аб будаўніцтве універсітэцкай сталовай, здольнай забяспечыць патрэбы студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта. Рашэнне гэтага пытання будзе практычнай рэалізацыяй задач, якія выказаны ў прамове Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева на Усесаюзным злёце студэнтаў і ў пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму паляпшэнню матэрыяльных і жыллёва-бытавых умоў студэнтаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў».

У гэтым навучальным годзе двойчы праводзіліся праверкі ў інтэрнаце на вуліцы Кастрычніцкай. Пры першай праверцы быў выяўлен вялікі беспарадак. Пры паўторнай праверцы становішча прыкметна палепшылася.

Практыка работы сектара быту выявіла неабходнасць арганізаваць спецыялізаваную вучобу членаў гэтага сектара, прыцягваючы для гэтай мэты ўрачоў СЭС і нашага здраўпункта.

**СЕКТАР ПА РАЗГЛЯДУ ЗАЯЎ І СКАРГ І ЎДАСКАНАЛЕННЮ РАБОТЫ ЎПРАЎЛЕНЧАГА АПАРАТУ** (кіраўнік **В. А. Раманенка**).

Гэты сектар упершыню быў створан у саставе ГНК універсітэта. Ім здзейснена пэўная карысная работа. Члены сектара праверылі стан справаводства ў агульнай канцылярыі і дэканатах гістарычнага і філалагічнага факультэтаў. Выказаны канкрэтныя рэкамендацыі па ліквідаванню істотных недахопаў. Праведзеная сектарам у студзені 1971 года паўторная праверка паказала, што рэкамендацыі ў асноўным выкананы.

Было арганізавана сістэматычнае дзяжурства членаў бюро ГНК (двойчы ў тыдзень) і правядзенне кансультацый па пытаннях савецкага права супрацоўнікамі юрыдычнага факультэта і юрысконсультам універсітэта.

Вывучан парадак прыёму наведвальнікаў ва універсітэце і разгляду заяў і скарг. Па матэрыялах ГНК партком прыняў спецыяльную пастанову, у якой была намечана сістэма мер, накіраваных на ліквідаванне адзначаных недахопаў.

Матэрыялы сектара далі падставы паставіць пытанне аб арганізацыі сістэматычнай вучобы кіруючых кадраў універсітэта (дэканаў і іх намеснікаў, загадчыкаў кафедр, начальнікаў аддзелаў і служб універсітэта) па пытаннях навукі кіравання.

У супрацоўніцтве з ГНК факультэтаў вывучана пытанне аб вызначэнні правоў і абавязкаў вучэбна-выхаваўчага персаналу ва універсітэце. Добрую ініцыятыву праявілі фізічны факультэт і АГЧ, дзе дастаткова дакладна вызначаны службовыя абавязкі супрацоўнікаў у спецыяльных інструкцыях.

**СЕКТАР ПА КАНТРОЛЮ ЗА ХОДАМ КАПІТАЛЬНАГА БУДАЎНІЦТВА І БЯГУЧАГА РАМОНТУ** (кіраўнік **І. З. Собалеў**).

Гэты сектар упершыню быў створан у саставе ГНК у сувязі з тым, што ва універсітэце вядзецца вялікае капітальнае будаўніцтва, і для калектыву неабыякава, як яно вядзецца.

У другім квартале 1970 года сектарам сумесна з ГНК АГЧ старанна праверана якасць будаўніча-мантажных работ у новым вучэбна-лабараторным корпусе, які ўведзен у эксплуатацыю ў канцы 1969 года. Выяўлена многа дэфектаў і недаробак. Выказаны рэкамендацыі і прынят шэраг мер па іх ліквідаванню.

У канцы снежня мінулага года ГНК абмеркавала інфармацыю сектара аб планаванні капітальнага будаўніцтва на 1971 год і яго матэрыяльным забеспячэнні. Рэкамендацыі ГНК разгледжаны на расшыранай нарадзе, і па іх намечаны канкрэтныя меры.

У кастрычніку гэтага года кіраўніком сектара І. З. Собалевым была праверана гатоўнасць вучэбных будынкаў і інтэрнатаў да новага навучальнага года. Адзначана, што ў 1971 годзе падрыхтоўка да заняткаў прайшла больш арганізавана, створаны больш спрыяльныя ўмовы для нармальнай работы ў вучэбных карпусах, лепш арганізаван быт у студэнцкіх інтэрнатах.

**СЕКТАР ПА АХОВЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ УЛАСНАСЦІ** (кіраўнік **В. М. Сітнікаў**).

Праверана ўлік, ахова і расходаванне дарагакаштуючых матэрыялаў і хімікатаў на кафедрах паўправаднікоў, агульнай фізікі і аналітычнай хіміі; сумесна з сектарам навуковай працы высветлена, як выкарыстоўваецца навуковае абсталяванне на хімічным факультэце.

На разгляд парткома універсітэта падрыхтавана пытанне сумесна з галоўным бухгалтарам тав. Бяляўскім аб стане і мерах па паляпшэнню захоўвання сацыялістычнай маёмасці ва універсітэце.

***

**Канферэнцыя прызнала работу ГНК БДУ здавальняючай.**

**У пастанове адзначана неабходнасць удзелу ў пасяджэннях груп, калі абмяркоўваюцца пытанні работы факультэта, кафедры, аддзела, кіраўнікоў адпаведных падраздзяленняў.**

**Прызнана мэтазгодным устанавіць тэрміны разгляду рэкамендацый груп народнага кантролю і інфармаванне іх аб выніках разгляду.**

---

Выступаючы ў спрэчках па дакладу, старшыня ГНК біялагічнага факультэта прафесар **А. М. Сташкоў** выказаў заклапочанасць тым, што на біяфаку па-ранейшаму бяздзейнічае ліфт, не падведзены вада і тэхнічны ток. Да гэтай пары не створана вытворчая база факультэта.

— Недахопаў яшчэ шмат, —падкрэсліў А. М. Сташкоў, —і народныя кантралёры павінны і далей выкрываць іх і дапамагаць лепш наладзіць працу.

Дырэктар выдавецтва БДУ **Л. А. Севасцьянчык** звярнула ўвагу на адказнасць калектываў кафедр, вучоных саветаў факультэтаў за якасць літаратуры, якая рэкамендавана да выдання. Фармальны падыход пры абмеркаванні запланаваных выданняў прыводзіць да таго, што выдавецтва часам атрымлівае адмоўныя рэцэнзіі на прапанаваныя выдавецтву рукапісы.

— Мне здаецца, — гаворыць Л. А. Севасцьянчык,— што гэтым пытаннем павінен зацікавіцца народны кантроль.

Выдавецтва БДУ існуе тры гады, а друкарня і таго больш, аднак народныя кантралёры ні разу не паглядзелі, як мы працуем. У нас няма складскіх памяшканняў для захоўвання паперы і пераплётных матэрыялаў. У друкарні няма дзе паставіць новае абсталяванне. Патрэбен рамонт памяшканняў. Думаецца, ГНК трэба пашырыць кола сваёй дзейнасці і звярнуць больш увагі на выдавецтва і друкарню.

Аб становішчы ў буфетах і сталовых, аб тым, як лепш весці работу тым кантралёрам, якія будуць займацца харчовымі аб'ектамі, гаварыла памочнік санітарнага ўрача Кастрычніцкага раёна г. Мінска **Р. І. Прымакова**.

Прарэктар БДУ па адміністрацыйна - гаспадарчай частцы **І. А. Ажыгін** падкрэсліў вялікую адказнасць тых задач, якія вырашаюць народныя кантралёры, і спыніўся на такім важным участку, як захаванне сацыялістычнай маёмасці ў БДУ.

— На геаграфічным факультэце мы ў кароткі тэрмін памянялі мэблю на новую. Цяпер яна ўся запэцкана, дэрмацін парэзан. Нездавальняюча захоўваецца абсталяванне і ў студэнцкіх інтэрнатах.

Я звяртаюся да членаў ГНК: захаванне сацыялістычнай маёмасці павінна быць вашым паўсядзённым клопатам.

І. А. Ажыгін адказаў на шэраг пытанняў. У прыватнасці, ён паведаміў, што работу ліфтаў намечана наладзіць ужо ў снежні гэтага года, паколькі атрыманы нарады на так неабходныя лябёдкі. Будзе зроблен рамонт памяшканняў выдавецтва і друкарні.

— Сектарамі ГНК зроблена шмат праверак,—гаворыць загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў Камітэта народнага кантролю БССР **О. А. Здаравенін**, —а якая іх эфектыўнасць— з дакладу не адчуваецца. Дакладчык не сказаў, у выніку якіх праверак адбыліся пасяджэнні рэктарата, кафедры...

Мне здаецца, што ГНК БДУ не варта распыляць свае сілы. Лепш правесці тры-чатыры франтальныя праверкі. Вынікі былі б больш адчувальныя.

Група народнага кантролю БДУ рашала многія пытанні, аднак пытанні, звязаныя з навукова-тэхнічным прагрэсам, выпалі з яе поля зроку. Таму мы не ведаем, як укараняюцца ў практыку дасягненні навукі, якая іх эфектыўнасць. Гэтыя пытанні павінны заняць вядучае месца ў дзейнасці новага складу ГНК БДУ.

---

**Канферэнцыя выбрала новы састаў універсітэцкай групы народнага кантролю ў колькасці 45 чалавек. Сярод іх: 23 выкладчыкі, 14 супрацоўнікаў і 8 студэнтаў.**

**Адбылося арганізацыйнае пасяджэнне ўноў выбранай групы народнага кантролю БДУ. Старшынёй групы выбран Я. М. ТАГУНОЎ. Намеснікамі: Е. А. АКІНЧЫЦ (кіраўнік сектара арганізацыйнай работы), С. Р. ДРАБЯЗКА (кіраўнік сектара навуковай работы).**

**Кіраўніком сектара вучэбнай работы выбран А. Д. АНДРЭЕЎ, кіраўніком сектара па разгляду заяў і скарг і ўдасканаленню ўпраўленчага апарату універсітэта — В. А. РАМАНЕНКА, кіраўніком сектара па ахове сацыялістычнай уласнасці—В. Ф. БОХАН.**

*10 снежня ў 16 гадзін у парткоме адбудзецца пасяджэнне універсітэцкай групы народнага кантролю з павесткай дня:*

*1. Зацвярджэнне плана работы групы на 1972 год.*

*2. Зацвярджэнне плана заняткаў у «Школе народных кантралёраў» на 1972 год.*

*3. Арганізацыйныя пытанні.*

*На пасяджэнне павінны з'явіцца члены універсітэцкай групы і старшыні факультэцкіх груп народнага кантролю.*

# ПА ПУЦЁЎЦЫ ДРУЖБЫ

Калі ва універсітэцкім камітэце камсамола было атрымана запрашэнне на XVIII камсамольскую канферэнцыю Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта, многія былі трошкі здзіўлены, бо не ведалі, што гэта —адна са шматлікіх традыцый універсітэта. Запрашэнне — традыцыя яшчэ маладая, але ёсць і старыя. Як-ніяк, а Вільнюскі універсітэт хутка будзе святкаваць свае 400 год.

Сапраўды, і нізкія скляпенні старога будынка універсітэта, і шматлікія маленькія дворыкі, і цяжкія дубовыя, каваныя жалезам дзверы—усё гэта, нібы сівізна на галаве чалавека, гаворыць аб вялікім узросце.

І толькі звонкія галасы, якія гучаць у старажытных аўдыторыях, сведчаць аб сённяшняй маладосці універсітэта...

«Сцяг не так цяжка ўзняць, як цяжка пранесці яго ў паўсядзённым жыцці». Гэтыя мудрыя словы літоўскага паэта Мацэвічуса напісаны на адным з плакатаў у актавай зале універсітэта, дзе праходзіць XVIII камсамольская канферэнцыя.

Многа добрых спраў на рахунку камсамольцаў універсітэта. Гэта паспяховая вучоба большасці камсамольцаў і тое, што кожны чацвёрты студэнт-камсамолец — член СНТ, і шматлікія будаўнічыя атрады, працаваўшыя не толькі ў Літве, але і ў ПНР, ЧССР, ГДР, Туркменіі, на Алтаі.

Вельмі цікавыя справы і ў інтэрнацыянальным клубе: сустрэчы з дэлегацыямі іншаземных студэнтаў, ажыўленая перапіска з інтэрклубамі іншых вну і г. д. Па ініцыятыве інтэрклуба некалькі разоў студэнты універсітэта выходзілі на дэманстрацыю з лозунгам «Свабоду Анджэле Дэвіс!».

Вельмі актыўна працуе і другі клуб універсітэта — турысцкі. Колькі паходаў па роднай Літве, ды і па ўсёй нашай краіне зрабілі аматары турызму. Нават дабраліся да Кольскага паўвострава. А гэтай зімой турысты нашага і Вільнюскага універсітэтаў разам зробяць паход па граніцы Літвы і Беларусі, менавіта па тых месцах, дзе геранчна змагаліся за свабоду літоўскія і беларускія партызаны. Гэты паход студэнты абодвух універсітэтаў прысвячаюць 50-годдзю ўтварэння СССР.

Шмат цікавага ўбачылі мы ў Вільнюскім універсітэце. Помнікі старажытнасці і сучасныя фізічныя лабараторыі, старыя традыцыі і шмат новага. А галоўнае, што мы знайшлі там,—дух дружбы і сяброўства. І гэта заканамерна—мы ж разам нясём адзіны сцяг.

Н. СІНКЕВІЧ.

## *Нашы юбіляры*

# ТВОРЧАГА ДАЎГАЛЕЦЦЯ!



Заўтра прафесару кафедры крымінальнага права нашага універсітэта доктару юрыдычных навук Іосіфу Ісакавічу Гарэліку споўніцца 50 год. Больш паловы з іх аддадзены навуцы. А шлях да яе пачаўся ў цяжкія гады, калі інвалід Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі, стаў студэнтам Ленінградскага юрыдычнага інстытута, а пасля аспірантам гэтага ж інстытута. У 1947 годзе І. І. Гарэлік абараняе кандыдацкую дысертацыю, у 1965—доктарскую.

Многія гады педагагічная і навуковая дзейнасць І. І. Гарэліка звязана з нашым універсітэтам. Выкладчыкі і студэнты юрфака ведаюць яго як высокакваліфікаванага педагога, здольнага навуковага работніка, уважлівага і чулага таварыша. Манаграфіі, вучэбныя дапаможнікі і навуковыя артыкулы юбіляра добра вядомы не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі (асабліва па такой малараспрацаванай праблеме, як прававыя пытанні трансплантацыі органаў і тканак).

Шмат увагі Іосіф Ісакавіч удзяляе падрыхтоўцы маладых навуковых кадраў, умела кіруе студэнцкім навуковым гуртком. А ў асяроддзі работнікаў судова-пракурорскіх органаў ён папулярны лектар. Часта прафесар І. І. Гарэлік выступае з лекцыямі перад насельніцтвам. Некалькі яго навукова-папулярных брашур па пытаннях права разлічаны на шырокае кола чытачоў. Актыўнай папулярызацыі навукі служаць і яго артыкулы ў саюзных і рэспубліканскіх газетах.

І. І. Гарэлік — нястомны грамадскі дзеяч. Ён— старшыня юрыдычнай секцыі і член прэзідыума навукова-тэхнічнага савета Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, галоўны рэдактар міжведамаснага зборніка па філасофіі, навуковаму камунізму, палітэканоміі і праву, член навукова-кансультатыўнага савета пры Вярхоўным Судзе і метадычнага савета Пракуратуры рэспублікі, народны засядацель абласнога суда. А на факультэце ён неаднаразова выбіраўся ў састаў партыйнага бюро факультэта. Цяпер — куратар вучэбнай групы.

Нядаўна Іосіф Ісакавіч узнагароджан Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Пажадаем юбіляру доўгіх год жыцця, добрага здароўя, далейшых поспехаў у навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці!

І. ЦІШКЕВІЧ,
загадчык кафедры крымінальнага права.

# САМІ ХІРУРГІ...



Тут усё, як пры сапраўднай аперацыі: белыя халаты хірурга і яго асістэнтаў, прастэрылізаваны хірургічны інструмент, вялікая лямпа над аперацыйным сталом. Толькі на сценах вісяць плакаты па анатоміі, стаяць муляжы, а з-за перагародкі са шкляных шафаў чуецца: «Крываносная сістэма чалавека складаецца...»

За дзвярыма з надпісам «Лабараторыя анатоміі чалавека» ідуць заняткі па эксперыментальнай хірургіі. Гэты курс вывучаецца ў раздзеле «Хірургічныя метады фізіялагічнага эксперыменту». У лабараторыі студэнты IV курса біялагічнага факультэта, якія спецыялізуюцца на кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл.

На аперацыйным стале звычайны шэры трус. Аперацыя прадстаіць складаная: трэпанацыя чэрапа.

— Такія вось аперацыі,—гаворыць выкладчык Канстанцін Іванавіч Грышан, — заключны этап вялікай вучэбнай работы. Перад гэтым мы ўсё да дробязей разбіраем тэарэтычна. Таму сёння кожны з рабят ведае, з чаго пачынаць, ведае магчымыя ўскладненні, сваё месца ля аперацыйнага стала.

Але як бы добра ні ведаў тэорыю, усё ж практыка ёсць практыка. Заўсёды можа быць нешта непрадбачанае. Хвалююцца хірургі. Іх сёння два: першы — Валодзя Сцепанюга, другі—Лена Яскевіч.

Студэнты ўсё робяць самі: даюць наркоз, рыхтуюць аперацыйнае поле. Часам бываюць і смешныя здарэнні: трус доўга не хоча засынаць. Нарэшце ўсё гатова. Шэсць галоў у белых шапачках з марлевымі павязкамі на тварах схіляюцца над сталом. Гучыць голас Валодзі: «Скальпель»! Галі Ількевіч другі раз паўтараць не трэба: спрытна падае яна патрэбны інструмент. Сёння Галя, як сказаў Канстанцін Іванавіч, галоўны тут чалавек — аперацыйная сястра.

Аперацыя цягнецца доўга. Пакрыўся кропелькамі поту лоб у першага хірурга; выбілася з-пад шапачкі пасмачка валасоў у Лены. Але вось зроблена апошняе шво на ране. Аперацыя скончана. Усе збіраюцца ў адным кутку, адкуль адразу чуюцца звонкія галасы спрэчкі.

— Ужо абмяркоўваюць аперацыю, — з задавальненнем усміхнуўся Канстанцін Іванавіч. — Сёння яна прайшла паспяхова. Усе працавалі зладжана, з веданнем справы. Студэнты адносяцца да такіх заняткаў вельмі сур'ёзна. Па праграме ў нас усяго 60 гадзін эксперыментальнай хірургіі, але яны даюць нямала. Можна нават сказаць, што студэнты змаглі б аказацца патрэбнымі ў вялікай хірургіі. Бо ўсім вядома: каб паставіць хранічны вопыт, трэба займацца эксперыментам. Акрамя таго, такія заняткі выклікаюць сапраўды глыбокую зацікаўленасць навукай.

Паглядзець аперацыі прыходзяць студэнты малодшых курсаў і навучэнцы мінскіх школ.

Л. ДРУЗЕВА.
*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

# 20 ГОД ВУЧОБЫ Ў СЯБРОЎ

Група студэнтаў з ГДР адзначае цудоўнае свята — прайшло 20 год з той пары, калі першыя нямецкія студэнты — пасланцы ГДР — пачалі вучобу ў СССР. Асновай гэтаму паслужыў дагавор аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, заключаны ўрадамі абедзвюх краін. Крыху пазней, 12 мая 1952 года, паследаваў дагавор аб навучанні грамадзян ГДР у вну Савецкага Саюза.

Прайшло толькі 6 год пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, і раны, нанесеныя савецкаму народу нямецкім фашызмам, яшчэ не зажылі, а ўжо першыя 95 студэнтаў, прыехаўшых вучыцца ў вну СССР, былі прадстаўнікамі міралюбівай сацыялістычнай Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Нашы студэнты былі сардэчна прыняты савецкім народам як самыя лепшыя сябры. І мы выказваем падзяку КПСС, ураду СССР і ўсяму савецкаму народу за вялікую дапамогу, аказаную нам. Без гэтай дапамогі ў выхаванні новай сацыялістычнай інтэлігенцыі ГДР не магла б дасягнуць такіх вялікіх поспехаў у сваім развіцці. Наш першы прэзідэнт Вільгельм Пік аднойчы сказаў: «Вучыцца ў Савецкага Саюза — значыць вучыцца перамагаць».

На працягу толькі 50 год савецкая навука дабілася велізарнага пад'ёму і сёння з'яўляецца вядучай навукай у свеце. Вучыцца ў савецкіх вышэйшых навучальных установах — гэта значыць атрымліваць багатыя веды, якія ў сучаснай барацьбе паміж сацыялізмам і імперыялізмам маюць вялікую каштоўнасць.

Наша маленькая група — першая дэлегацыя студэнтаў з ГДР, якая пачала вучобу ў БДУ. Нас прынялі вельмі шчыра і нам была аказана ўсебаковая дапамога: уладкаванне ў інтэрнаце або пытанні вучобы, знаёмства з горадам ці цяжкасці, звязаныя з авалоданнем рускай мовай,—усюды мы адчувалі падтрымку і клопаты беларускіх сяброў.

Святкаванне 50-годдзя БДУ было для нас такім жа ўрачыстым, як і для савецкіх таварышаў. А 7 лістапада мы разам з імі адзначалі гадавіну Вялікага Кастрычніка. Мы былі ў захапленні ад святочнай маляўнічай дэманстрацыі працоўных Мінска.

Нам хочацца падзякаваць беларускім сябрам за магчымасць вучыцца тут і за дапамогу, якую аказваюць нам.

Рыта ШУЛЬТЦЭ,
студэнтка І курса матэматычнага факультэта.



Студэнты II курса хімфака на лекцыі.

*СПОРТ*

## ВЯРНУЛІСЯ З ПЕРАМОГАЙ

У Брэсце праведзены занальныя спаборніцтвы першынства ВНУ рэспублікі па баскетболу. Тут сабраліся памерацца сіламі шэсць каманд: Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута (БІБІ), БПІ, БДУ, інстытута замежных моў, пэдінстытутаў Брэста і Мазыра.

Толькі дзве каманды трaплялі ў фінал. Вельмі роўную і стабільную гульню паказала зборная нашага універсітэта. У выніку пяцідзённай барацьбы на першым месцы з пяццю ачкамі былі баскетбалісты БДУ, на другім — БПІ.

Наступныя месцы занялі каманды БІБІ, інстытута замежных моў, пэдінстытута Брэста і пэдінстытута Мазыра.

Фінальныя спаборніцтвы каманда баскетбалістаў правядзе ў красавіку 1972 года.

С. КАМІНСКІ,
старшыня спортклуба.

## ЧАРУЮЦЬ ЦЫМБАЛЫ...

Ленінскі пакой студэнцкага інтэрната № 4, што на Паркавай магістралі, перапоўнен так, што нават дзверы прыйшлося адчыніць. Што здарылася? А здарэнне адно з прыемных. У госці да біёлагаў, філолагаў, юрыстаў прыйшоў артыст Беларускай дзяржаўнай філармоніі цымбаліст Мікалай Шмелькін.

Артыст расказаў аб гісторыі беларускіх цымбал, аб сваім творчым шляху. 26 гадоў аддаў гэты чалавек любімай справе. Уздоўж і ўпоперак аб'ездзіў ён з канцэртамі нашу краіну, выступаў у ГДР, Польшчы, Венгрыі і іншых краінах, заслужыў званне лаўрэата Усесаюзнага і рэспубліканскага конкурсаў.

...Льецца цудоўная мелодыя «Паланеза Агінскага», гучаць творы Франца Шуберта, цыганскія напевы. І кожны раз, перад тым як выканаць твор, Мікалай Шмелькін гаворыць некалькі слоў пра яго аўтара, гісторыю стварэння.

Усе ведаюць «Танец з шаблямі» А. Хачатурана, «Гумарэску» беларускага кампазітара Глебава з кінафільма «Саша-Сашанька», але ў выкананні на цымбалах слухалі, мабыць, упершыню.

Завяршыла канцэртную праграму п'еса, напісаная самім Мікалаем Шмелькіным «Музыкальныя карцінкі Кубы».

М. ВЯРГЕЙЧЫК.

### ЦІКАВАЯ СУСТРЭЧА

*✦ На журфаку адбылася сустрэча з дырэктарам аб'яднання «Тэлефільм» С. М. Мар'яхіным, рэжысёрам «Масфільма» Е. І. Ташковым і заслужаным артыстам РСФСР Ю. М. Саломіным. Госці расказалі аб сваёй нялёгкай прафесіі, падзяліліся творчымі планамі, адказалі на пытанні студэнтаў.*

*Л. ІВАНОВА.*

## ІМ «ДАРОГА ЗВІНІЦЬ СТРУНОЮ»



Трагедыя адбылася вясной. У Мінск вясна прыйшла з вясёлым звонам капяжоў і першымі парасткамі зялёнай травы ў трэшчынах асфальту. У Саянах яна пачалася са снежных абвалаў, адзін з якіх аказаўся ракавым для дзевяці альпіністаў. Сярод загінуўшых быў і Арык Круп — інжынер Мінскага завода імя Вавілава, паэт і кампазітар.

Гэты вечар турысцкай песні 27 лістапада ва універсітэце — сустрэча сяброў у памяць аб ім.

— «Горы далёкія, прыгожыя, сінія... Вы даяце цудоўнае пачуццё палёту, узамен адбіраючы сяброў. Праклятыя горы, любімыя горы...» — гэта сумная песня В. Бокава прысвечана Арыку.

Нейкі вельмі незвычайны настрой на гэты раз у актавай зале універсітэта. Тысячы вачэй накіраваны на сцэну. А там — толькі хлопцы з гітарамі ды простая дэкарацыя, на якой — будзёнаўка, чырвоная гваздзіка, сілуэты блакітных гор «у ёжыку тайгі» і рад белых палатак ля падножжа. Аднак з якой напружанай увагай зала ўслухоўваецца ў кожнае слова са сцэны, каб праз некалькі хвілін узарвацца бясконцымі авацыямі.



Светлая, чаруючая лірычная сіла песень В. Глазанава (Ленінград), В. Мінаева (Куйбышаў), В. Бокава і В. Мураўёва (Казань), В. Сачкова і Ю. Кукіна (Ленінград), В. Макарава (Мінск) паланіла ўсіх.

Іх новыя песні аб тых, каму «самай высокай узнагародай сталі над брацкай магілай родныя бярозы і вечная памяць у сэрцах мільёнаў», і проста аб сябрах і гадах. Яны спяваюць і пра горы, пра снежныя маршруты, пра тое, як каханыя чакаюць і не чакаюць.



Гэтыя песні таксама пра іх саміх, хто крочыць па свеце. Песня ўвайшла ў жыццё гэтых хлопцаў, яна стала часткай іх вялікай любві да жыцця. Ім «дарога звініць струною: дык кроч жа, кроч»...

Але рана ці позна «ўсе дарогі кальцом замыкаюцца» (гэта словы адной з апошніх песень Арыка Крупа). Сябры Арыка ўмовіліся, што такім кальцом для іх стане Мінск. Кожны год, 30 кастрычніка, яны будуць збірацца тут, каб ушанаваць памяць загінуўшых турыстаў.

В. ЖУК.

*НА ЗДЫМКАХ: выступаюць (зверху ўніз) В. МАКАРАЎ (Мінск), В. МІНАЕЎ (Куйбышаў), В. МУРАЎЁЎ і В. БОКАЎ (Казань).*

Фота аўтара.

## АЎТОГРАФ НА ФІЛФАКУ





**НА ЗДЫМКАХ:** (уверсе) гутарка з дзяўчатамі, якія дэманстравалі мадэлі адзення; (злева і справа) у дэманстрацыйнай зале.

З УСІМ нядаўна энтузіястамі III і II курсаў філалагічнага факультэта быў створан клуб цікавых сустрэч «Аўтограф на філфаку». Арганізатары паставілі перад сабой пэўныя мэты і задачы. Па-першае, арганізацыя сустрэч з цікавымі людзьмі. Па-другое, адказваць на запатрабаванні і пытанні студэнтаў не толькі свайго факультэта, але і ўсіх тых, хто цікавіцца літаратурным і мастацкім жыццём рэспублікі.

На днях адбылася першая проба сіл клуба. Ідэя сустрэчы з мастакамі рэспубліканскага Дома мадэляў узнікла невыпадкова. На агульнауніверсітэцкім сходзе было закранута пытанне аб паўсядзённым адзенні студэнта. Знешні выгляд чалавека, праблема моды і культуры адзення хвалюе кожнага з нас, бо адзенне стварае настрой не толькі асабісты, але і тых людзей, з кім сутыкаешся. Мы і папрасілі дырэкцыю Дома мадэляў дапамагчы разабрацца ў пытаннях моды.

Валянціна Міхайлаўна Капусцінская, галоўны мастак-мадэльер, расказала філфакаўцам аб лініях, сілуэтах, напрамках сучаснай моды. У час змястоўнага і цікавага расказу мастака-мадэльера адбылася дэманстрацыя мадэляў.

**Е. МАЦЯШ,**
**старшыня клуба «Аўтограф на філфаку».**



## ГРЫП—ГЭТА НЕБЯСПЕЧНА!

Грып —вострае інфекцыйнае захворванне. Ён лёгка перадаецца ад хворых да здаровых і таму хутка распаўсюджваецца сярод насельніцтва. Грып—каварная хвароба. Часта нават пры лёгкім працяканні ён дае цяжкія ўскладненні.

Выклікаюць грып драбнюткія мікраарганізмы —вірусы, якія трапляюць у арганізм чалавека з удыхаемым паветрам. Ад моманту пранікнення віруса ў арганізм да пачатку захворвання праходзіць 24—48 гадзін. Хвароба пачынаецца з павышэння тэмпературы, недамагання, галаўных болей. Затым пачынаецца насмарк, кашаль, боль пры рухах вачэй, патлівасць. Часта грып працякае без павышанай тэмпературы.

Прычына захворвання пры грыпе заўсёды—хворы чалавек. Хворы выдзяляе вірусы пры размове, кашлі, чыханні разам з капелькамі сліны. Капелькі могуць разлятацца на 2—3,5 метра ад хворага. На прадметах вірус захоўваецца ад 3 да 10 сутак. Таму небяспечны не толькі хворы, але і прадметы, якія яго акружаюць і якімі ён карыстаецца (посуд, бялізна і г. д.).

Як жа зберагчыся ад грыпа? Важнейшая ўмова—старраннае падтрыманне правіл асабістай гігіены.

Трэба часцей праветрываць памяшканне. Патокамі паветра выносяцца часцінкі пылу і слізі з вірусамі.

Як мага часцей праводзіць вільготную ўборку памяшканняў.

Старанна мыць рукі і твар з мылам пасля догляду за хворым, вяртання з занятkаў, язды ў гарадскім транспарце і г. д. Мыльныя растворы знішчаюць 85—95 працэнтаў бактэрый, якія трапляюць на скуру.

Неабходна загартоўваць арганізм; арганізаваць правільнае харчаванне з ужываннем дастатковай колькасці вітамінаў. Часнок і цыбуля ў даным выпадку вельмі карысныя, таму што утрымліваюць спецыяльныя рэчывы—фітанцыды, якія знішчаюць мікробаў.

Пры дагляданні хворага патрэбна карыстацца маскамі, пашытымі з 4—5 слаёў марлі. Надзяваць іх трэба так, каб яны закрывалі рот і нос. Маскі затрымліваюць да 90 працэнтаў мікробаў.

Выконваючы правілы санітарыі і гігіены, прафілактычныя мерапрыемствы па папярэджанню грыпа, можна значна панізіць яго распаўсюджанне.

А. БІМ, урач.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 09517 Заказ 1437